База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# «Навіны» са старажытных летапісаў

Маскоўскі даследчык гісторыі А. Членаў у сваёй кнізе «Па слядах Дабрыні» выказаў гіпотэзу, што ў IX—X стагоддзях Гомельшчына была не проста месцам рассялення радзімічаў, а «стабільным векавым княствам са сваімі органамі дзяржаўнай улады». Іншымі словамі, гісторык мяркуе пра існаванне старажытнай Радзіміцкай дзяржавы са сталіцай у Гомелі. Так гэта ці не, але гіпотэза А. Членава наводзіць на думку, што пры існаванні такой дзяржавы Гомель павінен быў мець і свой летапіс. Адшукайся такі летапіс сёння, напэўна, моцна змяніліся б нашы ўяўленні пра свой край і горад.

Што датычыцца паведамленняў з іншых беларускіх летапісаў, дык іх надзвычай мала, яны ўрыўкавыя. Хоць і іх мы, жыхары Гомельшчыны, не ведаем.

Гісторыя нашага краю — гэта перш за ўсё гісторыя войнаў. Таму беларускія летапісы — гэта пераважна хронікі ваенных падзей. Напрыклад, Хроніка Быхаўца паведамляе пра тое, як татары на чале з перакопскім царэвічам Махмет-Гірэем у 1505 годзе пачалі свой наступ на беларускія землі з пераправы цераз Дняпро каля Лоева. Гэта было не апошняе наступленне татараў і не першае. Яшчэ ў 1263 годзе, як паведамляе «Кроніка» М. Стрыйкоўскага, адбылася бітва татарскага хана Кідана пад Мазыром. Цікава, што Мазыр адносіцца летапісцамі да рускіх земляў, а ўжо Тураў, як і Пінск, Брэст, Гродна, Полацк і іншыя, рускімі гарадамі не называюцца. На такую асаблівасць звярнуў увагу вядомы беларускі даследчык летапісаў М. Улашчык. Ён, дарэчы, упершыню грунтоўна прааналізаваў хронікі старажытнага Магілёва. У гэтым аналізе, які змешчаны ў кнізе Улашчыка «Уводзіны ў вывучэнне беларускага летапісання», таксама трапляюцца «навіны» пра колішнюю Гомельшчыну і сам Гомель. Напрыклад, у «Магілёўскай хроніцы Т. Р. Сурты і Трубніцкіх» паведамляецца пра тое, што ў Гомелі ў 1706 годзе стаяў з дывізіяй князь А. Д. Меншыкаў. Гэтая падзея адносіцца да руска-шведскай вайны.

Зразумела, куды больш навінаў маглі б паведаміць нам Гомельскія хронікі. Дзе ж яны? Магчыма, згарэлі ў адной са шматлікіх войнаў, а магчыма, ляжаць дзе-небудзь на падстрэшшы закінутай хаты.

**А. МЯЛЕШКА.**